УДК 947. 6 (05)

# Генацыд яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі генеральнай акругі “Літва” (на прыкладзе заходніх раёнаў Віцебскай вобласці)

**А.І. Корсак**
*Установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны універсітэт»*

*Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці прац, у якіх закраналася праблема генацыду яўрэйскага насельніцтва Беларусі, застаецца шмат звязаных з ёю маладаследаваных праблем, таму ў дадзеным артыкуле аб’ектам даследавання з’яўляецца правядзенне нацысцкай Германіяй палітыкі ізаляцыі яўрэйскага насельніцтва і працэс знішчэння гета на тэрыторыі заходніх раёнаў Віцебскай вобласці ў 1941 – 1942 гг. У працы вырашаюцца наступныя задачы: па-першае, прааналізаваны працэс адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу акупіраванай тэрыторыі Беларусі, які праводзіўся нацысцкімі органамі ўлады ў 1941 – 1942 гг.; па-другое, паказаны меры, якія прадпрымаліся нямецка-фашысцкімі акупантамі дзеля пазбаўлення асоб яўрэйскай нацыянальнасці палітычных і эканамічных праў; па-трэццяе, разглядаецца працэс знішчэння вязняў гета на прыкладзе заходніх раёнаў у межах сучаснай тэрыторыі Віцебскай вобласці, у прыватнасці гета г.п. Відзы Браслаўскага раёна і г.п. Лынтупы Пастаўскга раёна.*

***Ключавыя словы**: Вялікая Айчынная вайна, гета, яўрэйскае насельніцтва, акупацыйны рэжым, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, Віцебская вобласць, генеральная акруга “Літва”.*

## Genocide of the Jews on the territory of General District Lithuania (based on the example of western areas of Vitebsk region)

**A.I. Korsak**
*Polotsk State University*

*In spite of numerous scientific papers on the problem of Genocide of Jews in Belarus there are a lot of problems on it which are not investigated enough. Therefore the object of the present research is isolation of Jews by Nazi Germany in western areas of Vitebsk region and extermination of ghettos in 1941-1942. In the article the following problems are considered. First, the analysis of the process of administrative and territorial division in Belarus*

*during Nazi occupation in 1941-1942 is given. Secondly, measures directed on depriving Jews of national, economical and political rights taken by Nazi invaders are shown. Thirdly, the process of annihilation of prisoners of a ghetto on the example of western areas within the modern territory of Vitebsk region (Vidzy settlement of Braslav district, Lyntupy settlement of Postavy district) is considered.*

***Keywords**: The Great Patriotic War, ghetto ,Jewish population, occupational regime, administrative and territorial division, Vitebsk region, General district "Lithuania".*

Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя абставіны, а таксама рашэнні дыпламатаў на высокім узроўні, прывялі да знішчэння 6 млн. еўрапейскіх яўрэяў у гады другой сусветнай вайны. Дакументы, якія маюць дачыненне да праблемы генацыду яўрэйскага насельніцтва, не вызначаюцца сваёй шматлікасцю. Па-першае, некаторыя пытанні не фіксаваліся нацыстамі пісьмова; па-другое, у выніку ваенных дзеянняў, асабліва апошніх этапаў Вялікай Айчыннай вайны, многія дакументы былі знішчаны; па-трэццяе, тыя матэрыялы, якія знаходзяцца цяпер у сценах архіваў, або не заўсёды з'яўляюцца даступнымі для даследчыкаў, або не вызначаюцца сваёй інфарматыўнасцю. У апошні час гісторыкі ўсё часцей пачалі звяртацца да вуснай гісторыі праз размовы з відавочцамі падзей 1941 – 1945 гг. Безумоўна, гэтая крыніца не з'яўляецца абсалютна дакладнай, таму з'яўляецца патрэба разглядаць вышэй вызначаныя крыніцы комплексна.

Тым не менш, нягледзячы на тое, што адны дакументы страчаны для гісторыі, а іншыя раскіданы па розным месцам, даследчыкі праблематыкі Халакосту спрабуюць даць поўную аб'ектыўную карціну, звязанную з генацыдам яўрэйскага насельніцтва не толькі на тэрыторыі еўрапейскіх краін, але і на Беларусі таксама.

**Матэрыял і метады**. У дадзеным артыкуле аўтар на падставе архіўнага матэрыяла з выкарыстаннем успамінаў відавочцаў разглядае працэсс стварэння гета з наступным знішэннем яго вязняў на тэрыторыі заходніх раёнаў у межах сучаснай Віцебскай вобласці, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны ўваходзілі ў склад генеральнай акругі "Літва".

Тэарэтыка-метадалагічным падмуркам даследавання з'яўляюцца прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці. У артыкуле выкарыстоўваюцца дзве групы метадаў – агульнанавуковыя: абагульненне, параўнанне, класіфікацыя, аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, а таксама спецыяльна гістарычныя: гісторыка-генетычны і гісторыка-сістэмны метады, якія дазволілі паказаць арганічную сувязь ідэалогіі нацысцкай Германіі са з'яўленнем і ажыццяўленнем палітыкі "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання", выявіць асноўныя яе этапы, формы і метады, а таксама ахарактарызаваць сістэму ідэалогіі і палітыкі гітлераўскай Германіі ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Яшчэ да пачатку ваенных дзеянняў супраць СССР нацысты распрацавалі план адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу акупіраваных у будучым зямель, рэалізацыя якога з некаторымі змяненнямі адбылася восенню 1941 г. Так, тэрыторыя з улікам нацыянальнасці насельніцтва і ў прыблізным суаднясенні з межамі дзеянняў груп армій дзялілася спачатку на рэйхскамісарыяты: "Украіна" на чале з Э. Кохам і "Остланд", якім кіраваў Г. Лозе. Рэйхскамісарыяты складаліся з генеральных акруг: "Беларусь", "Літва", "Валынь – Падолія", "Жытомір", тылавы раён групы армій "Цэнтр". Генеральныя акругі ў сваю чаргу падзяляліся на абласныя акругі (гебіты) [1].

Што датычыцца паўночна-заходняй тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны і Міншчыны, то яе лёс канчаткова быў вырашаны вясной 1942 г. Так, паводле Загада № 10 ад 20 сакавіка 1942 г. генеральнага камісара ў Каўнасе частка Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі "Літва" на чале з генеральным камісарам Андрыянам фон Рэнтэльнам. Такім чынам, па выніках адміністацыйна-

тэрытарыяльнага падзелу Відзы (цяпер Браслаўскі раён) былі ўведзены ў склад Швянчонскага уезда Вільнюскага гебіта, а Лынтупы (цяпер Пастаўскі раён), у сваю чаргу, – у склад Свірскага уезда Вільнюскага гебіта генеральнай акругі "Літва" [2]. Такое перапланаванне тэрыторый, магчыма звязана з палітыкай нацыстаў у дачыненні да літоўскага насельніцтва, якое на самым пачатку распаўсюджвання нацыянал-сацыялістычных ідэй Гітлера было больш схільна да палітыкі Германіі, чым да Савецкай Расіі, тым самым немцы хацелі пашырыць тэрыторыю Літвы за кошт беларускіх зямель.

Так, Швянчонінскі уезд быў акупіраваны немцамі 27 чэрвеня 1941 г. Адразу былі ўстаноўлены нацысцкія органы акупацыйнай улады на яго тэрыторыі, кіраўнікам якога быў прызначаны Міколас Кукутіс, бургамістрам горада – Вінцас Блажыс. На чале паліцыі ў 1941 г. стаяў маёр Пятрас Янушкавічус. Свае абавязкі мясцовае кіраўніцтва выконвала старанна, асабліва калі гэта датычылася яўрэйскага насельніцтва, жыццё і правы якіх абмяжоўваліся рознымі распараджэннямі акупацыйных улад. Так, камісар Вюльнюскага гебіта Х. Вульф 18 жніўня 1941 г. выдаў загад сваім падначаленным на месцах аб абавязаннасці яўрэяў насіць апазнавальныя знакі і пражываць у гета. На падставе дадзенага распараджэння М. Кукутіс 25 жніўня 1941 г. даводзіць да мясцовага яўрэйскага насельніцтва аб забароне набываць прадукты харчавання ў сялян на вуліцах і паблізу дарог, наведваць рынкі да 11 гадзін дня, дазвалялася купляць прадукты ў магазіне але толькі ў прамежак часу з 17 да 18 гадзін [2].

Трэба адзначыць, што гета на пачатак акупацыі дадзенай тэрыторыі яшчэ не было створана – яўрэі працягвалі пражываць на сваіх старых месцах. Але былі знішчаны непатрэбныя, на погляд нацыстаў, элементы з ліку яўрэйскага насельніцтва, пакінулі толькі тых, хто меў пэўную працоўную кваліфікацыю і іх сем'і. Пра гэта сведчыць справаздача камандуючага аператыўнай каманды – 3 аб вырашэнні яўрэйскага пытання ў Літве (чэрвень 1941 г.): "Я магу сёння сцвярджаць, што мэта вырашыць яўрэйскую праблему ў Літве выканана аператыўнай камандай 3. У Літве больш няма яўрэяў, акрамя тых, хто патрэбны для працы і іх сем'яў. Гэта: у Шаўляі 4 500 чал., у Каўнасе 15 000, у Вільнюсе 15 000… Гэта яўрэі і іх сем'і ні ў якім разе не павінны быць расстраляны…(пер. аўтара.)" [3].

У чэрвені 1941 г. нямецкія войскі ўступілі ў Відзы. Асаблівасцю населенага пункта было тое, што на яго тэрыторыі не адбывалася значных баёў. Галоўныя напрамкі наступлення вермахта мінулі яго.

У першы тыдзень акупацыі нацысты прыступілі да канчатковага вырашэння "яўрэйскага пытання" на рэгіянальным узроўні. Так, у раёне Відзаўскага возера было расстраляна каля 50 чалавек яўрэяў, у тым ліку дзеці, старыя і жанчыны. "Перад расстрэлам іх падвергглі зверскім пыткам: жанчын і дзяўчат распраналі дагала, гвалтавалі і забівалі, а потым усіх загналі ў возера. Прычым частка яўрэяў патанула, а астатніх расстралялі на беразе возера" [4]. У тэкстах дзённіка дырэктара бібліятэкі Вільнюскага гета Германа Крука пададзена іншая лічба – 80 чалавек [2].

Восенню гэтага ж года было створана гета ў межах сучасных вуліц Пушкіна і Горкага г.п. Відзы, старастай прызначаны Л. Левін[1]. Умовы існавання былі невыноснымі, скіраваныя, у першую чаргу, на фізічнае знішчэнне праз голад, холад і распаўсюджанне розных інфекцыйных хвароб. Акрамя таго, вязні гета кожны дзень выконвалі свае працоўныя абавязкі перад акупацыйнымі ўладамі на патрэбы нацысцкай Германіі. Паводле ўспамінаў мясцовай жыхаркі В.М. Дзевянчуковай: "… мне было 9 год, калі немцы прыйшлі ў Відзы, у пасёлку яны стварылі гета, якое было агароджана дротам, знаходзілася ў Відзах за ракой. Памятаю, як зараз, у немцаў былі вялізныя плошчы памідор, а яўрэі іх палолі…"[2].

Вясной 1942 г. сярод вязняў распаўсюдзілася эпідэмія сыпнога тыфу. Вядома, што немцы баяліся розных інфекцыйных захворванняў, таму дзеля барацьбы з хваробай на

---

[1] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Адамовіч В.М. 1926 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна

[2] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Дзевянчуковай В.М. 1932 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна

тэрыторыю гета быў адпраўлены ўрач Х. Гінзбург. Згодна яго успамінаў пасля прыбыцця на тэрыторыю лагера: "… гета было агароджана высокім плотам, але аховы не было. Тэрыторыя лагера была вызвалена ад мясцовага беларускага і польскага насельніцтва. Выхад быў вольны. Так было да восені 1942 г. Сыпным тыфам захварэла чалавек каля 10, іх удалося ізаляваць…" [5].

16 ліпеня 1942 г. Вільнюскі акруговы камісарыят інфармаваў біржу працы, што ў Відзаўскім гета знаходзіцца 444 працаздольных яўрэя – 291 мужчына і 153 жанчыны. 6 жніўня 1942 г. Швянчонская біржа працы даводзіць да ведама Вільнюскай біржы працы, што ў Відзаўскім гета пражывае 1 505 яўрэяў. Сярод іх 721 чалавек – працаздольныя мужчыны і жанчыны. У той час на розных работах было занята 520 яўрэя гета, у 210 працаздольных вязняў гета не было працы [2].

У канцы лета ў зоне беларуска-літоўскага памежжа была праведзена акцыя па ліквідацыі малых гета. Перад акцыяй акупацыйныя ўлады рабілі рэгістрацыю ўсіх працаздольных яўрэяў, каб ведаць, колькі яўрэяў можна пакінуць у жывых і колькі знішчыць непрацаздольных.

У пачатку лістапада 1942 г. у Відзы прыбылі паліцэйскія атрады украінцаў і літоўцаў. Афіцыйнай версіяй іх прыезда была арганізацыя экспедыцыі ў раёне Каз'янскага леса [5].

Паводле ўспамінаў відавочцаў: "… калі яўрэі даведаліся, што іх будуць страляць, яны прыходзілі да людзей хавацца. Хавалі і ў маёй сям'і яўрэйскага пастуха, ён у нас прабыў два дні, а на трэці дзень, уночы, пастукалася яго радня і забрала. Былі і такія ў пасёлку, якія за гэта бралі грошы. Мы грошаў не бралі, як жа не пусціш, калі тыя падалі на калені. Людзі раней былі дружныя і не баяліся смерці, хоць і разумелі, што іх чакае за ўкрыццё яурэяў толькі смерць. Немцы то немцамі, але і былі мясцовыя бандыты, каторыя здекваліся з яўрэяў і рабавалі іх, але пра гэта даведаліся немцы і вывезлі бандытаў за могілкі. Доўга іх там мучалі, патрабавалі аддаць нарабаванае, а потым расстралялі"[3].

Наконт таго, калі было знішчана Відзаўскае гета, існуе рознагалоссе. У Расійскай яўрэйскай энцыклапедыі падаецца дата – снежань 1942 г. [6]. У літоўскім выданні "Гетто Ошмянского, Свирского, Швянчёнского уездов: списки узников" на падставе дадзеных Літоўскага дзяржаўнага цэнтральнага архіва наогул сказана, што "… восенню ўсе відзаўскія яўрэі (за выключэннем 72 чалавек) былі пераведзены ў Швянчонскае гета. Затым 4 красавіка 1943 г. яны разам з астатнімі вязнямі былі вывезены ў Вільнюс і на наступны дзень расстраляны ў Панярай" [2]. Тое, што нацысты пачалі акцыю па ліквідацыі гета ў Відзах восенню 1942 г., пацвярджаюць і ўспаміны мясцовых жыхароў: "… у саміх Відзах яўрэяў не расстрэльвалі, восенню іх вывезлі за пасёлак"[4]. Колькасць знішчанага яўрэйскага насельніцтва ў гета Відзаў падаецца ў 2 708 чалавек [4; 6]. З вышэй прыведзеных дадзеных можна меркаваць, што частка яўрэяў Відзаў была знішчана непасрэдна ў мястэчку, а частка (верагодна, працоўная) пераведзена спачатку ў Швянчонскае, а затым Вільнюскае гета, вязні якога часткова былі знішчаны ў 1943 г., астатнія пераведзены ў лагеры Эстоніі з наступнай ліквідацыяй у 1944 г. [7]. Улічваючы тое, што згодна ўспамінам Х. Гінзбурга, украінскія і літоўскія атрады прыбылі на тэрыторыю Відзаў у лістападзе 1942 г., а на момант 22 лістапада гэтага ж года гета яшчэ існавала, то можна зрабіць вывад аб ліквідацыі часткі гета ў лістападзе – снежні, адсюль і ідзе розніца ў датах знішчэння відзаўскіх вязняў.

Інфармацыя пра падзеі, звязанныя з лёсам Лынтупскага гета, амаль адсутнічае за выключэннем матэрыялаў вуснай гісторыі.

Як было згадана вышэй, згодна Загаду № 10 ад 20 сакавіка 1942 г., які ўступіў у сілу 1 красавіка таго ж года, Лынтупы ўвайшлі ў склад Свірскага уезда Вільнюскага гебіта. Першыя падраздзяленні нямецкага вермахта у Свіры з'явіліся 24 чэрвеня 1941 г. Нямецка-фашысцкія

---

[3] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Дзевянчуковай В.М. 1932 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна

[4] Запісана ў 2008 г. Корсак А.І. ад Дзевянчуковай В.М. 1932 г.н., г.п. Відзы Браслаўскага раёна

акупанты на тэрыторыі уезда дзейнічалі па ўжо наладжанаму механізму: ствараліся новыя органы улады, выдаваліся распараджэнні адносна мясцовага насельніцтва, у тым ліку і асоб яўрэйскай нацыянальнасці. У 1942 г. на чале новастворанай адміністрацыйна-тэрытырыяльнай адзінкі быў прызначаны Йонас Хмеляускас, яго намеснікам – Юргіс Лудавічус, старшынёй уезднай паліцыі – Канстанцінас Пятраускас. Прыблізна ў канцы 1941 г. у Свіры было створана гета, на чале Юдэнрата, колькасцю каля 4 чалавек, стаў Хаім Рэзнік. Праіснавала яно да канца 1942 г. – вязняў гета перавялі ў канцлагер для яўрэйскага насельніцтва, што знаходзіўся ў в. Міхалішкі [2].

Нямецка-фашыскія акупанты ўвайшлі ў Лынтупы ў чэрвені 1941 г.

Што датычыцца Лынтупскага гета, то ў апублікаваных крыніцах Літоўскага дзяржаўнага цэнтральнага архіва маюцца звесткі перапісу насельніцтва ад 1942 г. пасля новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, згодна якому яўрэйскія гета існавалі і ў іншых гарадах Свірскага уезда – Гервятах (55 чалавек), Канстанцінаве (26 чалавек), Астраўцы (102 чалавекі), у тым ліку і Лынтупах (150 чалавек). [2]. Але архіўных звестак пра тое, якім чынам яно было створана і ў якіх абставінах было знішчана, не выяўлена.

Пасля рэгістрацыі яўрэйскага насельніцтва нацысты адзначылі іх дамы. Паводле слоў З. Кацковіча ў Лынтупах было створана гета ў канцы 1941 г., якое ахоўвалі літоўскія паліцэйскія фарміраванні – гэта было найбольш характэрна для той часткі тэрыторыі Пастаўшчыны, якая была аднесена да генеральнай акругі "Літва".

Згодна ўспамінаў І. Стэфановіча "яўрэяў спачатку сагналі ў дом Завадскага, які знаходзіўся ў раёне плошчы. Затым іх рассялілі па пяці дамах па вуліцы Красоўскай. Гета знаходзілася пад аховай. Дамы былі з забітымі вокнамі. Старшынёй ў гета немцы прызначылі маладую дзяўчыну імя якой Бася". У снежні 1942 г. вязні гета былі выгнаны на вуліцу, адкуль у калоне адзін за адным іх павялі за чыгуначную дарогу ў бок лесу. Расстрэлам лынтупскіх яўрэяў займаліся літоўскія паліцаі, у выніку было знішчана каля 93 чалавек [8].

Усяго, па дазеным выдання "Памяць Беларусі", у Лынтупах было знішчана каля 240 чалавек [9]. Улічваючы, што расстрэлы яўрэйскага насельніцтва на беларускіх тэрыторыях, у тым ліку і заходнія раёны Віцебскай вобласці, былі распаўсюджаннай з'явай адразу пасля пачатку ваенных дзеянняў у чэрвені – ліпені 1941 г., то дадзеная лічба з'яўляецца найбольш верагоднай.

**Заключэнне.** Такім чынам, гета на тэрыторыі заходніх раёнаў Віцебскай вобласці ў сучасных яе межах, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны, а дакладней згодна Загаду № 10 ад 20 сакавіка 1942 г., знаходзіліся ў складзе генеральнай акругі "Літва", існавалі параўнальна невялікі прамежак часу. Так, гета ў Відзах праіснавала каля года – восень 1941 г. – восень-снежань 1942 г. Прыкладна такі ж самы тэрмін дзеяння характэрны і для Лынтупскага гета (канец 1941 г. – снежань 1942 г.). Невялікі тэрмін існавання быў характэрны для ўсіх малакольсных гета на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Спіс крыніц і літаратуры


1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2001. – 688 с.
2. Гетто Ошмянского, Свирского, Швянчёнского уездов: списки узников. – Вильнюс: Литовский государственный центральный архив, 2009. – 659 с.
3. Трагедия Литвы: 1941 – 1944 годы. Сборник архивных документов. – М.: Европа, 2006. – 400 с.
4. НАРБ. – Ф. 845. – Воп. 1. – Спр. 64. – Л. 3
5. Ханоих Давидович Гинзбург. Видзы Браславский район. Режим доступа: http://shtetle.co.il/Shtetls/vidzy/vidzy.html.
6. Видзы // Российская Еврейская Энциклопедия. Режим доступа: http://rujen.ru/index.php
7. Крысин, М.Ю. Прибалтийский фашизм. История и современность / М.Ю. Крысин. – М.: Вече, 2007. – 576 с.

8. Шульман, А. Хранитель памяти. Режим доступа: http://shtetle.co.il/Shtetls/lyntupy/hranmem.html.
9. Памяць Беларусі: Рэспублканская кніга / Рэд. Кал.: Г.П. Пашкоў (гал. Рэд.) і інш.; Маст. У.П. Свентахоўскі. – Мн.: БелЭН, 2005. – С. 202.